окажется по-настоящему многогранным тогда, когда он будет дополнен соответствующими разработками по специальным предметам, формирование которых в настоящее время осуществляют профилирующие кафедры факультетов совместно с кафедрами социально-гуманитарных наук университета.

**А.І.Смолік**, *доктар культуралогіі, прафесар*

## ТЭАРЭТЫКА-МЕТАДАЛАГІЧНЫЯ ПРАБЛЕМЫ КУЛЬТУРАЛАГІЧНАЙ АДУКАЦЫІ Ў ВНУ КУЛЬТУРЫ І МАСТАЦТВАЎ

Станаўленне адукацыі, якая спалучае ў сабе фундаментальную агульнанавуковую і спецыяльную падрыхтоўку з духоўным, мастацка-эстэтычным і маральным, грамадзянскім развіццём асобы студэнта, а таксама пераход на новыя арганізацыйныя і метадычныя прынцыпы выкладання дысцыплін сацыяльна-палітычнага і гуманітарнага цыклаў патрабуюць змены месца і ролі культуралагічнай падрыхтоўкі ў сістэме вышэйшай мастацкай адукацыі.

Вывучэнне культуралогіі ў ВНУ культуры і мастацтваў вынікае перш за ўсё з гуманітарызацыі адукацыі. У канцы XX ст. чалавецтва востра адчула крызіс тэхнакратычнага мыслення і метадалогіі, дэфіцыт культурнага самаасэнсавання сучаснай цывілізацыі. Гуманітарызацыя адукацыі з яе культуралагічным аспектам дазволіць змякчыць негатыўныя наступствы навукова-тэхнічнага прагрэсу, наблізіць сучасную навуку да гуманістычнага ідэалу.

Сучасныя падыходы да вызначэння мэты і задач мастацказнаўчай адукацыі грунтуюцца на разуменні неабходнасці забеспячэння шырокай дэмакратызацыі і гуманітарызацыі гэтага пра-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

цэсу, якія даюць магчымасці моладзі авалодваць дасягненнямі сусветнай і айчыннай культуры, вызначаць свае светапоглядныя пазіцыі, выбіраць духоўныя каштоўнасці і развіваць творчыя здольнасці. Статус спецыяліста XXI ст. будзе вызначацца не сацыяльным паходжаннем, а роляй і месцам культуры ў сістэме прыярытэтаў духоўнага жыцця. Як і раней, найбольш вострай застанецца праблема набыцця ўласнай ідэнтычнасці. Працэсы станаўлення мастака, музыкі і рэжысёра будуць непасрэдна звязаны з вызваленнем яго ад ціску тых стэрэатыпаў, якія ён адчувае знешне, з інтэнсіўным ростам яго самасвядомасці, са здольнасцю самому вызначаць свой творчы шлях. Безумоўна, жыццёвы і прафесіянальны поспех творцы будзе ў многім залежаць ад узроўню патрэбнасці грамадства ў прадуктах яго мастацкай дзейнасці.

У сувязі з гэтым культуралагічная адукацыя павінна рыхтаваць творчую моладзь да асобаснай арыентацыі ў сучасным свеце, да асэнсавання яго як сукупнасці культурных дасягненняў чалавечага грамадства, садзейнічаць узаемаразуменню і прадукцыйным сувязям прадстаўнікоў розных культур. У выніку вывучэння культуралагічных дысцыплін студэнты мастацка-творчых ВНУ павінны атрымаць уяўленне аб разнастайнасці і самакаштоўнасці розных культур, умець арыентавацца ў культурным асяроддзі сучаснага грамадства, быць здольнымі ўдзельнічаць у дыялогу культур.

Праблемы тэарэтыка-метадалагічнага характару ў выкладанні культуралогіі выклікаyы тым, што як навуковая і вучэбная дысцыпліна яна яшчэ знаходзіцца ў стадыі станаўлення, удакладнення свайго зместу і метадаў, яе абрысы як навуковай дысцыпліны не набылі завершанага тэарэтычнага зместу. Цяжкасці станаўлення культуралогіі, выкладаемай у ВНУ, перш за ўсё вынікаюць са складанасці і мнагапланавасці паняцця культуры як анталагічнага феномена. На XVII сусветным філасофскім кангрэсе, які быў прысвечаны праблеме «Філасофія і культура», вучоныя прадэманстравалі шырокі спектр падыходаў да культуры. Абмеркаванне названай праблемы паказала, што ў сусветнай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

культуралагічнай думцы няма не толькі адзінага разумення культуры, але і агульнага погляду на шляхі яе вывучэння, здольныя пераадолець метадалагічны разнабой. Гэтая задача з'яўляецца не толькі тэарэтычнай, але і практычнай, якая з асаблівай вастрынёй паўстала сёння перад вышэйшай мастацкай школай.

Стракатасць поглядаў прадстаўнікоў беларускай і замежнай культуралагічнай думкі тлумачыцца многаэлементнасцю і разнастайнасцю культуры па сваім складзе. Таму пры выкладанні культуралагічных дысцыплін у ВНУ культуры і мастацтваў неабходна вывучаць не толькі розныя бакі, аспекты, грані, уласцівасці культуры, але і розныя формы яе існавання – мастацтва, мараль, рэлігія, навука і іншыя, розныя яе інстытуты – палітычныя, прававыя, сістэму адукацыі, масавыя камунікацыі, розныя культурныя працэсы – формы кіравання, абслугоўвання, разнастайнасці зносін людзей. З гэтага вынікае істотная неабходнасць у рэдуцыраванні культуры рознымі дысцыплінамі да той ці іншай канкрэтнай формы яе быцця. Прадстаўнікамі кожнай з навук культура раскрываецца пэўнымі сваімі бакамі. Так, археолагамі культура разглядаецца як сукупнасць прадуктаў чалавечай дзейнасці, у якіх арэчаўлены сляды духоўнага свету і паводзін людзей. Этнограф пад культурай разумее спецыфічны для пэўнага этнасу комплекс звычаяў, абрадаў, вераванняў, асаблівасцей працы і быту людзей. Сацыёлаг бачыць у культуры галоўным чынам фактар інтэграцыі грамадства, сістэму сродкаў, з дапамогай якіх арганізуецца і рэгулюецца сумеснае жыццё людзей.

Такім чынам, задачай культуралагічнай падрыхтоўкі студэнтаў мастацка-творчых ВНУ з'яўляецца асэнсаванне культуры ў рэальнай цэласнасці і паўнаце канкрэтных формаў існавання, у яе будове, функцыянаванні і развіцці. Такую задачу здольна вырашыць толькі філасофія культуры, паколькі яна мае справу з цэласнымі сістэмнымі аб'ектамі. Вывучэнне філасофіі культуры студэнтамі дапаможа ім пераадолець вузкасць, аднабаковасць, частковасць інтрэпрэтацыі культуры, якія ўласцівыя канкрэтным навукам.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Сярод разнастайнасці ўяўленняў аб культуралогіі, на наш погляд, мэтазгодна вылучыць тры асноўныя падыходы. У адпаведнасці з першым культуралогія разглядаецца як комплекс дысцыплін, што вывучаюць розныя аспекты культуры. Пры такім падыходзе галоўнай мэтай культуралагічнай падрыхтоўкі павінна быць вывучэнне культуры ў яе гістарычным развіцці і сацыяльным функцыянаванні, у выніку чаго ў студэнтаў фарміруецца сістэма ведаў аб культуры.

Згодна другому падыходу культуралогія трактуецца як раздзел дысцыплін, што вывучаюць культуру. У гэтым выпадку назіраецца атаясамліванне з культуралогіяй філасофіі культуры, культурантрапалогіі, сацыялогіі культуры, іншыя нават вылучаюць філасофскую культуралогію як навуку аб сэнсах, значэннях, якія бяруцца ў іх цэласнасці ў адносінах да пэўнага рэгіёна ці перыяду часу.

У адпаведнасці з трэцім падыходам культуралогію разглядаюць як самастойную навуковую дысцыпліну са сваім прадметам і метадамі даследавання, пэўным месцам у сістэме сацыяльна-гуманітарных ведаў.

Безумоўна, названыя і іншыя метадалагічныя падыходы да разумення культуралогіі маюць права на існаванне. На наш погляд, у якасці зыходнага для станаўлення культуралогіі як вучэбнай дысцыпліны ў ВНУ культуры і мастацтваў неабходна выкарыстоўваць уяўленні аб культуралогіі як сістэме ведаў. У адрозненне ад студэнтаў прыродазнаўчых і інжынерна-тэхнічных ВНУ, якім неабходна мець звесткі аб паняццях і тэрмінах культуралогіі, ведаць важнейшыя школы і канцэпцыі сусветнай і айчыннай культуралогіі, этапы развіцця культуры, студэнты творчых ВНУ павінны разумець логіку асноўных канцэпцый культуры, супярэчнасці ў развіцці цывілізацыі і культуры XXI ст., валодаць навыкамі эстэтычнага і этычнага аналізу мастацкіх твораў і жыццёвых сітуацый, асновамі прафесійнай этыкі. Нам думаецца, што выпускнікі вышэйшай мастацкай школы павінны свабодна арыентавацца ў культуралагічнай, мастацка-эстэтычнай і мараль-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

най праблематыцы і паводзіць сябе ў жыцці ў адпаведнасці з патрабаваннямі, якія прад'яўляюцца да культурнай, інтэлігентнай і прафесійна падрыхтаванай асобы.

Прынцыпы культуралагічнай падрыхтоўкі, на наш погляд, павінны абапірацца на адэкватны механізм сваёй рэалізацыі. У Рэспубліцы Беларусь ужо існуе пэўная практыка выкладання культуралагічных дысцыплін у вышэйшай школе. Намі вывучана практыка культуралагічнай падрыхтоўкі ў ВНУ розных тыпаў, зроблены навуковыя высновы. Важнымі дакументамі, што вызначаюць прынцыпы і механізм культуралагічнай адукацыі, з'яўляюцца дзяржаўныя адукацыйныя стандарты па культуралогіі і мастацка-творчых спецыяльнасцях, распрацаваныя Беларускім дзяржаўным універсітэтам культуры, Беларускай акадэміяй музыкі, Беларускай акадэміяй мастацтваў і Беларускім інстытутам праблем культуры. Гэтыя стандарты дазволілі нам вылучыць некалькі блокаў культуралагічнай падрыхтоўкі студэнтаў мастацка-творчых ВНУ.

1. **Тэарэтычны.** Культуралогія, разглядаемая ў тэарэтычным аспекце, уключае ўяўленні аб асновах тэорыі культуры, тэарэтычнай і гістарычнай тыпалогіі культуры, а таксама галоўных школах, кірунках, канцэпцыях у культуралогіі. Думаецца, студэнтаў неабходна пазнаёміць з праблемамі культурнай і псіхалагічнай антрапалогіі, асабліва з пытаннямі дынамікі развіцця культуры, механізмамі перадачы яе праз пакаленні. Паўнацэнная культуралагічная адукацыя немагчыма без вывучэння розных культур, субкультур, культурных адзінак з мэтай тлумачэння падабенства і адрознення асобасных рыс, характарыстык, патэрнаў паводзін людзей.

Тэарэтычная культуралогія не ўяўляецца без вывучэння агульных прынцыпаў знакавай сістэмы. Студэнты творчых ВНУ павінны ведаць спосабы кадзіравання і трансляцыі культурнай інфармацыі ў сацыяльных каналах з дапамогай знакава-сімвалічных сістэм.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

На наш погляд, названыя тры галіны могуць сфарміраваць асноўныя тэарэтычныя ўяўленні аб сутнасці, прадмеце, катэгорыях, структуры і функцыях культуры.

2. Другі блок культуралогіі як вучэбнай дысцыпліны – **гістарычны**, мэтай якога з'яўляецца даследаванне генезісу і гістарычных этапаў развіцця культуры. Пры гэтым ставіцца задача пазнаёміць студэнтаў з гісторыяй сусветнай культуры і культурай Беларусі. Па нашым меркаванні, неабходна, каб студэнты адчулі поліфанізм сусветных культур, іх разнастайнасць. Пры выкладанні гэтага блока культуралагічных дысцыплін важна пазбегнуць еўропацэнтрызму, маналінейнага разумення культурнагістарычнага развіцця, у якім еўрапейская культура разумеецца не ў адпаведнасці са сваім укладам у культуру сучаснасці, а па мяркуемай універсальнасці шляхоў яе гістарычнага развіцця. У сувязі з гэтым узнікаюць неабходнасць рэканструкцыі многаварыянтнага генезісу культуры, вывучэнне асноўных тыпаў старажытных культур, ментальных палёў культур, якія належаць да рэгіёнаў Еўразіі, Усходняй, Сярэдняй, Паўднёвай, Паўднёва-Усходняй Азіі, Цэнтральнай Афрыкі, Лацінскай Амерыкі, Паўночнай Амерыкі. На гэтым фоне становіцца магчымым выяўленне своеасаблівасці і унікальнасці еўрапейскай культуры.

Паколькі поўнае гістарычнае вывучэнне культурных рэгіёнаў свету ў межах праграмы ВНУ немагчыма, мэтазгодна сканцэнтраваць намаганні на гісторыі еўрапейскай культуры, а пры знаёмстве с традыцыйнымі культурамі прасачыць, як рэалізаваўся ў іх еўрапейскі імпульс, як ён трансфармаваўся ва ўмовах дыялога культур.

Вывучэнне гісторыі беларускай культуры неабходна ажыццяўляць у ходзе выкладання асобнага курса гісторыі айчыннай культуры. Такі падыход дазволіць выявіць уласную логіку развіцця беларускай культуры, яе самабытнасць. Безумоўна, гістарычны шлях, які прайшла беларуская культура, неабходна вывучаць у цеснай сувязі з культурнымі працэсамі, што адбыва-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ліся ў суседніх краінах, а таксама ў Заходняй і Цэнтральнай Еўропе.

У шэрагу беларускіх ВНУ вывучэнне айчыннай культуры адбываецца паралельна з еўрапейскай, шляхам уключэння тэм на храналагічнай ці тыпалагічнай аснове. Думаецца, такі варыянт больш уласцівы вышэйшым навучальным установам негуманітарнага профілю. Улічваючы, што выпускнікам мастацка-творых ВНУ давядзецца непасрэдна працаваць у сацыякультурнай сферы, займацца фіксацыяй, захаваннем і трансляцыяй культурных здабыткаў, неабходна глыбокае вывучэнне культурна-гістарычнай спадчыны беларускага народа.

Трэці блок складаюць **гуманітарныя дысцыпліны**, якія непасрэдна мяжуюцца з тэорыяй і гісторыяй культуры. Маюцца на ўвазе такія вучэбныя дысцыпліны, як этналогія, гісторыя, філасофія, эстэтыка, этыка, рэлігіязнаўства, сацыялогія, паліталогія, эканоміка, псіхалогія. Усе яны звязаны пэўным чынам з культуралогіяй праз прамежкавыя дысцыпліны і садзейнічаюць фарміраванню ў студэнтаў сістэмы ведаў аб культуры. Так, агульная філасофія звязана з культуралогіяй праз філасофію культуры, якая вывучае ментальныя характарыстыкі асобы чалавека як прадстаўніка пэўнай культуры і як своеасаблівую «канфігурацыю», складанае «перакрыжаванне» мноства культур. На наш погляд, паўнавартасная культуралагічная падрыхтоўка немагчыма без вывучэння гэтых і іншых сацыяльна-гуманітарных дысцыплін. Зразумець мнагазначнасць і складанасць паняцця культуры, якое ўключае станаўленне чалавека як суб'екта творчай дзейнасці, гістарычна канкрэтныя формы гэтай дзейнасці на розных этапах грамадскага развіцця ў рамках этнасаў, эпох і фармацый, апрадмечаных у яе выніках, дасягненнях чалавецтва ў розных канкрэтных сферах грамадскага жыцця, можна праз вывучэнне не толькі гісторыі і тэорыі культуры, а цэлага комплексу гуманітарных дысцыплін.

У структуры культуралагічнай падрыхтоўкі студэнтаў творчых ВНУ значную ролю адыгрываюць мастацтвазнаўчыя дысцы-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

пліны. Гэта абумоўлена тым, што мастацтва адлюстроўвае культурна-гістарычную сітуацыю ў цэлым і рэалізуе, акрамя пазнавальнай, яшчэ і геданістычную функцыю. Важна, што ў мастацкай культуры найбольш поўна і яскрава праяўляюцца творчыя сілы чалавека. Вывучэнне мастацкай культуры студэнтамі адкрывае шырокія магчымасці фарміравання маралі будучых спецыялістаў праз вылучэнне і творчае ўвасабленне універсальных праблем, якія маюць непасрэдныя адносіны да кожнага чалавека, такіх як сэнс жыцця і шчасця, дабро і зло, любоў і нянавісць, сумленне, віна і адказнасць і інш.

Неабходна таксама адзначыць, што мастацкая культура з'яўляецца часткай, дакладней падсістэмай, культуры, сярэдзінным яе пластом, дзе духоўнае і матэрыяльнае, унутранае і знешняе, змест і форма выступаюць у пэўнай, хоць і вельмі рухомай раўнавазе. Мастацкая культура – гэта, як вядома, мастацтва, якое ў сваю чаргу складаецца з паасобных канкрэтных відаў, жанраў. У сувязі з гэтым студэнты, вывучаючы музыку, выяўленчае мастацтва, тэатр, архітэктуру, кіно, пашыраюць культуралагічную прастору, паглыбляюць веды аб культуры як цэласнай сістэме.

**І.М.Стрыжонак,** *ст.выкладчык*

## УЗАЕМАСУВЯЗЬ БІБЛІЯТЭКАЗНАЎСТВА З САЦЫЯЛЬНА-ГУМАНІТАРНЫМІ ДЫСЦЫПЛІНАМІ ЯК СРОДАК ФАРМІРАВАННЯ МІЖПРАДМЕТНАГА МЫСЛЕННЯ СТУДЭНТАЎ

Сучаснае сацыякультурнае становішча характарызуецца інтэграцыйнымі тэндэнцыямі ў навуцы і адукацыі. Інтэграцыя навук забяспечваецца адзінствам аб'екта і метадаў даследавання, паняційнага апарату. Агульным аб'ектам выступае сацыякуль-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ